*Магнацкі двор і сацыяльнае ўзаемадзеянне (XV–XVIII стст.): зборнік навуковых прац / Пад рэд. А. М. Янушкевіча. Мінск, 2014.*

*Віталь Галубовіч*

# Двор магната і павет: віцебская кліентэла віленскага ваяводы Крыштафа Радзівіла ў 30-я гг. XVII ст.

Дадзены тэкст з'яўляецца спробай абагульнення інфармацыі пра ролю Віцебшчыны ў палітычнай гульні знакамітага правадыра пратэстанцкага руху ў Вялікім княстве Літоўскім – Крыштафа Радзівіла (1585–1640 гг.), віленскага ваяводы з 1633 г. і вялікага гетмана ВКЛ з 1635 г.

Асоба Крыштафа Радзівіла неаднаразова прыцягвала ўвагу даследчыкаў[1], але далёка не ўсе аспекты дзейнасці магната вычарпальна асвятляюцца ў гістарыяграфіі. Напрыклад, застаецца актуальнай праблема памераў уплыву магната ў асобных рэгіёнах ВКЛ. Да апошніх трэба аднесці і Віцебскае ваяводства. Улічваючы наяўнасць такога прабелу ды, асабліва, актуальнасць для гістарычнай навукі вывучэння палітычнай геаграфіі, як ў сінхранічным, так і ў дыяхранічным вымярэнні, паспрабуем акрэсліць патэнцыял Віцебскага і, у пэўнай ступені, Аршанскага павета ў палітычнай стратэгіі біржанскіх Радзівілаў.

## Увага да намінацыйнай палітыкі манарха

Тое, што ўся тэрыторыя ВКЛ з'яўлялася абсягам уплываў біржанскіх Радзівілаў, сумнявацца не выпадае. Віцебскае ваяводства ў гэтым сэнсе не з'яўлялася выключэннем. Нават з рэляцый сына Крыштафа Радзівіла – Януша, які ў першай палове 1630-х гг. стала знаходзіўся пры каралеўскім двары, вынікае, што ваяводу цікавіла ўсё, што датычыцца абодвух паветаў

[1] У першую чаргу гэта працы польскіх даследчыкаў Г. Віснэра, У. Аўгустыняк. Гл. спасылкі ніжэй.

© В. Галубовіч

Віцебскага ваяводства.

Так, з Варшавы 6 верасня 1634 г. Януш пісаў: «На аршанскае харуства смаленскі ваявода са сваімі прыхільнікамі прапаноўвае нейкага пана Весялоўскага, а пан падканцлер разам з літоўскім пісарам пана старосту … Сапегу, і мяне таксама просяць, каб іх у гэтым падтрымаў. Я разумею, што гэты больш прыдатны, чым той, і, калі гэта будзе даспадобы вашай княскай міласці, то было б добра, каб ваша княская міласць папярэдзіў элекцыяй сваю просьбу ў яго каралеўскай міласці»[2]. Пазней з Львова Януш паведамляў бацьку: «з аршанскім харуствам яго каралеўская міласць абяцаў пачакаць ажно да элекцыі, разумею, што яно пана Млоцкага не абміне, калі стане электам»[3].

Адносна гэтай намінацыі няма пэўнасці. Ёсць звесткі, што ў 1634 г. аршанскі харужы Я. В. Стэцкевіч памёр, а з іншых крыніц вынікае, што ён жыў яшчэ да 1636 г.[4] Але малаверагодна, каб Януш памыляўся. Змест вераснёўскага 1634 г. ліста Януша Радзівіла наўпрост сведчыць пра наяўнасць у магната магчымасці ўплываць на аршанскі павятовы соймік з мэтай арганізацыі належнай падтрымкі.

Дарэчы, самога амбітнага Януша кар'ера аршанскага старосты не вабіла, і ён на пачатку 1635 г. адмовіўся ад «благой і адлеглай юрыдыкі», а ў лютым таго ж года пісаў, што «…таксама сам чакаю абяцанай адносна Оршы ўзнагароды…»[5]. Крыху пазней, у лісце ад 3 ліпеня 1636 г. з Вільні, Януш палічыў патрэбным даслаць на двор бацькі паведамленне пра рашэнне Уладзіслава адносна віцебскіх земскіх судовых урадаў: «Гаспадар злоўжывае абяцанкамі, бо калі нават і памятае, то слова не трымае. Пісарства віцебскае аддаў пад уплывам князя канцлера і пана ваяводы смаленскага нейкаму пану Гурку. На падсудкоўства яшчэ не прыйшла элекцыя, але і пра тую ідзе злая варажба, таіу што князь канцлер з ксяндзом рэферэндарыем пачалі апякацца панам Горскім…»[6]. Размова ў гэтым лісце датычыцца сітуацыі, якая склалася ў Віцебскім павеце пасля смерці земскага падсудка Яна Андрэевіча Сівіцкага ў 1636 г. і, верагодна, памер-

[2] Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie (далей – AGAD), Archiwum Radziwiłłów (далей – AR), dz. IV, sygn. 178, s. 65.

[3] AGAD, AR, dz. IV, sygn. 178, s. 80.

[4] Радаман А., Галубовіч В., Вілімас Д. Земскія ўраднікі Віцебскага ваяводства ў другой палове XVI – першай палове XVII стст. // Commetarii Polocenses Historici. 2005. T. II. C. 57.

[5] AGAD, AR, dz. IV, sygn. 179, s. 33, 35.

[6] AGAD, AR, dz. IV, sygn. 182, s. 7.

лага неўзабаве яго наступніка Крыштафа Войны-Ясенецкага[7].

Зрэшты, палітычны пасьянс у паветах ВКЛ, у тым ліку Віцебскім, цікавіў Крыштафа Радзівіла да апошніх дзён жыцця, як сведчыць даследаванне знакамітай знаўцы двара князя Уршулі Аўгустыняк[8].

## Віцебскія кадры Радзівіла

З'яўляючыся апекуном усёй пратэстанцкай супольнасці ВКЛ, віленскі ваявода, несумненна, найбольшую падтрымку мог чакаць ад сваіх аднаверцаў. У найбліжэйшае кола давераных асобаў князя ўваходзілі і католікі з праваслаўнымі, але гэта датычылася пераважна тых абшараў, дзе размяшчалася яго маёмасць. Віцебскае ваяводства не належала да рэгіёнаў, дзе біржанскія Радзівілы адчувалі сябе вельмі ўпэўнена. Польская даследчыца У. Аўгустыняк сцвярджае, што «Паветы … аршанскі і віцебскі ў трыццатыя гады XVII ст. былі апанаваныя сапегаўскай групоўкай»[9], але адначасова прыводзіць шмат прыкладаў, якія, у пэўнай ступені, супярэчаць гэтаму тэзісу. Найноўшыя даследаванні польскага гісторыка Марыюша Савіцкага не дазваляюць адназначна казаць пра дамінацыю на Віцебшчыне тых ці іншых груповак[10]. Варта нагадаць і пра такую цікавую акалічнасць: перад элекцыйным соймам 1632 г. К. Радзівіл накіраваў у Віцебскі павет 15 лістоў, а ў Аршанскі – 31, што, у прынцыпе, адпавядае колькасці лістоў, якія высылаліся з княскай канцылярыі ў іншыя рэгіёны[11]. Адрасаванне амаль пяці дзясяткаў спецыяльных пасланняў можа разглядаць і як ілюстрацыю магчымых памераў уплыву К. Радзівіла на Віцебшчыне.

З іншага боку, ёсць сведчанні, што ў сярэдзіне 1630-х гг. біржанскія Радзівілы сапраўды стрымлівалі свае прэтэнзіі адносна Віцебшчыны. Так, у знакамітых прапановах Пятра Кахлеўскага на новаўтвораныя пасады ў ВКЛ Віцебскі павет увогуле не згадваецца, а праекты радзівілаўскага клі-

[7] Радаман А., Галубовіч В., Вілімас Д. Земскія ўраднікі Віцебскага ваяводства... С. 53.

[8] Augustyniak U. Dwór i klientela Krzysztofa Radziwiłła (1585–1640): mechanizmy patronatu. Warszawa, 2001. S. 212.

[9] Ibid. S. 196.

[10] Так, польскі даследчык не прыйшоў да адназначнай высновы пра палітычную арыентацыю ўплывовай у Віцебскім павеце ўрадніцкай сям'і Гуркаў: Sawicki M. Stronnictwo dworskie w Wielkim Księstwie Litewskim w latach 1648–1655. Opole, 2010. S. 177.

[11] Wisner H. Rzeczpospolita Wazów. Czasy Zygmunta III i Władysława IV. Warszawa, 2002. S. 87.

ента Пятра Кахлеўскага адносна Аршанскага павета, як адзначае Анджэй Рахуба, былі рэалізаваныя толькі часткова: прапанаваны на пасаду падчашага Ян Цадроўскі яе не атрымаў, але гэты ўрад трапіў да іншага кальвініста – Ю. Друцкага-Саколенскага[12].

Галоўным апірышчам Радзівілаў на Віцебшчыне былі іх аднаверцы, а вызнаўцаў кальвінізму там сапраўды хапала. Увогуле ж, мясцовая каталіцкая шляхта (напр. Войны-Ясенецкія) не выяўляла асаблівага рэлігійнага фанатызму[13]. Таму звернем спачатку ўвагу на ўрадніцка-родавыя кланы Віцебскага павета.

## Віцебскі павет

**Храпавіцкія.** Клан Храпавіцкіх быў шчыльна звязаны з біржанскімі Радзівіламі праз прыналежнасць да кальвінізма[14]. У часы Жыгімонта Вазы асаблівых кар'ерных поспехаў яны ў Віцебскім павеце не дасягнулі, але мелі фактычна «спадчынны» урад стольніка, які ім належаў з 1607 г. на працягу ўсёй першай паловы стагоддзя. Яшчэ адным урадам, які яны кантралявалі ў 1630-я гг., было віцебскае гарадніцтва, якое ў 1635 г. належала Юрыю Храпавіцкаму[15]. На думку М. Савіцкага, Ян і Крыштаф Храпавіцкія ўвайшлі ў склад фракцыі біржанскіх Радзівілаў у 1638 г.[16], што, напэўна, не зусім так, паколькі супрацоўніцтва Крыштафа Храпавіцкага з пратэстанцкай галіной Радзівілаў пачалася прынамсі з 1599 г.[17] Найбольш заўважным прадстаўніком сям'і, які ў 1630-я гг. шчыльна камунікаваў з дваром віленскага ваяводы, быў Крыштаф Храпавіцкі, віцебскі стольнік у 1634–1647 гг. Ён быў не толькі актыўным карэспандэнтам ваяводы, які паведамляў пра падзеі ў павеце. Асаблівай увагі заслугоўвае акцыя Храпавіцкага, здзейсненая ў 1632 г., па рэвізіі гродскіх і земскіх актаў для пошуку дакументаў, якія датычаць рэлігійных свабодаў[18]. Непакоючыся за пераход свайго сына Яна ў каталіцызм, К. Храпавіцкі наўмысна імкнуўся

[12] Rachuba A. Kandydaci Piotra Kochlewskiego da nowych urzędów litewskich w 1635 roku // Kwartalnik Historyczny. 1991. № 4. S. 99.

[13] Lidkie M. Od prawosławia do katolicyzmu. Ruscy możni i szlachta Wielkiego Księstwa Litewskiego wobec wyznań reformacyjnych. Białystok, 2004. S. 117.

[14] Ibid. S. 174.

[15] Wasilewski T. Wstęp // Chrapowicki J. A. Diariusz. Część pierwsza: lata 1656–1664. Warszawa, 1978. S. 19.

[16] Sawicki M. Stronnictwo dworskie... S. 46.

[17] Wasilewski T. Wstęp... S. 18.

[18] Lidkie M. Od prawosławia do katolicyzmu. S. 194.

ўладкаваць яго на службу да біржанскіх Радзівілаў, але яго намаганні звязаць дзяцей з кальвінізмам не спраўдзіліся[19].

Тым не менш, роля гэтага рода ў лабіраванні інтарэсаў віленскага ваяводы была ў рэгіёне хіба вызначальнай. У лісце, напісаным 14 снежня 1640 г., да віцебскага ваяводы К. Кішкі яго карэспандэнт Я. Мацкевіч наўпрост паведамляе, што за падваяводства для пана Кіселя трэба за падтрымку заплаціць 1000 злотых шляхце, сярод якой моцная апазіцыя «паноў ерэтыкоў» Храпавіцкіх[20]. На той момант на Віцебшчыне прадстаўнікоў роду сапраўды было нямала[21]. Храпавіцкія мелі трывалыя пазіцыі ў павеце яшчэ і таму, што былі пародненыя з мясцовымі шляхецкімі родамі. Той жа Крыштаф Храпавіцкі быў жанаты з Аленай Вайнянкай-Ясенецкай, сястрой Канстанціна, віцебскага земскага пісара ў 1633–1636 гг.[22]

**Стаброўскія**. Знакамітая ў першую чаргу парнаўскім каштaлянам Пятром (1556–1614 гг.), героем Сандамірскага рокашу, сям'я Стаброўскіх заўважна вылучалася на фоне іншых біржанскіх прыхільнікаў сваёй актыўнасцю на Белай Русі. Яшчэ з 1620-х гг. у Аршанскім павеце актыўна дзейнічаў Адам Стаброўскі, сын Пятра, кальвініст і сябра К. Радзівіла. З 1630-х гг. ён заўважаецца і ў Віцебскім павеце, дзе выбіраўся паслом[23]. З 12 снежня 1635 г. да 1644 г. Адам Стаброўскі займаў пасаду віцебскага падчашага, якую перадаў сыну Яну[24].

**Жабы**. Прадстаўнікі гэтага рода вядомыя ў земскай адміністарцыі Віцебскага павета з 1604 г., калі Мікалай Жаба стаў віцебскім падстоліям «за прычыною Льва Сапеги»[25]. Статус М. Жабы ў павеце дазваляюць вызначыць яго сваяцкія сувязі: ён з'яўляўся мужам Барбары Храпавічанкі, адзінай дачкі віцебскага харужага Яна, кальвініста па веравызнанні[26].

Да ліку канфідэнтаў Крыштафа Радзівіла, якія былі звязаныя з Віцебскім паветам, належаў Крыштаф Жаба, кальвініст і вайсковец, які здолеў назбіраць немалы маёнтак і перадаць яго сынам[27]. Ён сам альбо яго сын у

[19] Ibid. S. 184, 174.

[20] Augustyniak U. Dwór i klientela Krzysztofa Radziwiłła (1585–1640). S. 212.

[21] Wasilewski T. Wstęp... S. 16–21.

[22] Ibid. S. 19–20; Радаман А., Галубовіч В., Вілімас Д. Земскія ўраднікі Віцебскага ваяводства... С. 53.

[23] Augustyniak U. W służbie hetmana i Rzeczypospolitej... S. 354–355.

[24] Радаман А., Галубовіч В., Вілімас Д. Земскія ўраднікі Віцебскага ваяводства... С. 55.

[25] Тамсама.

[26] Wasilewski T. Wstęp... S. 17.

[27] Augustyniak U. W służbie hetmana i Rzeczypospolitej... S. 302.

1636 г. атрымаў урад віцебскага скарбніка[28]. Яшчэ адзін прадстаўнік гэтага роду, Аляксандр Жаба, трымаў у сярэдзіне 1630-х гг. урад віцебскага чашніка[29].

**Старасельскія (?)**. У пераліку паслоў на элекцыйны сойм 1632 г. Т. Кемпа пазначыў земскага віцебскага суддзю Самуэля Старасельскага (1616–1653 гг.) як магчымага кальвініста[30].

**Рэкуці**. Да партыі К. Радзівіла адносіўся і віцебскі скарбнік Саламон Рэкуць[31].

**Сівіцкія (?)**. У 1630-я гг. найбольш вядомым прадстаўніком роду быў Ян Андрэевіч Сівіцкі, віцебскі пісар земскі (1601–1613 гг.) і падсудак земскі (1613–1636 гг.)[32]. Няма пэўнасці, што да яго вернасці веры бацькі, але апошні, Андрэй Якубавіч, належаў да евангелісцкай грамады ды запавёў сябе пахаваць «обычаемъ збору евангелицкого»[33].

**Пышніцкія (?)**. Род вядомы на Віцебшчыне з XVI ст.[34]. З'яўляючыся прыхільнікамі праваслаўя, яны абаранялі інтарэсы дысідэнтаў. Сярод актыўных прадстаўнікоў рода варта назваць дэпутата на Трыбунал 1640 г. – Сямёна Пышніцкага[35].

## Аршанскі павет

Аршанскі павет Віцебскага ваяводства, з улікам спецыфікі яго памераў, структуры землеўладання і канфесійнага складу насельніцтва, менш цікавіў біржанскі двор, але і тут існавала кола асобаў, арыентаваных на Крыштафа Радзівіла.

**Саколенскія**. Асобныя прадстаўнікі вядомай у княстве сям'і Саколенскіх шчыльна супрацоўнічалі з біржанскім дваром. У ліку «слуг і сяброў»

[28] Радаман А., Галубовіч В., Вілімас Д. Земскія ўраднікі Віцебскага ваяводства... С. 55.

[29] Wasilewski T. Wstęp... S. 25.

[30] Kempa T. Wobec kontrreformacji. Protestanci i prawosławni w obronie swobód wyznaniowych w Rzeczypospolitej w końcu XVI i pierwszej połowie XVII wieku. Toruń, 2007. S. 403.

[31] Rachuba A. Kandydaci Piotra Kochlewskiego... S. 102.

[32] Радаман А., Галубовіч В., Вілімас Д. Земскія ўраднікі Віцебскага ваяводства... С. 53.

[33] Тастаменты шляхты і мяшчан Беларусі другой паловы XVI ст. (з актавых кніг Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі). Мінск, 2012. С. 206.

[34] Herbarz szlachty witebskiej. Kraków, 1898. S. 105–106.

[35] Deputaci Trybunału Głównego Wielkiego Księstwa Litewskiego (1586–1696): spis. Warszawa, 2007. S. 233.

К. Радзівіла быў князь Ян Юр'евіч Друцкі-Саколенскі, маршалак Аршанскага павета ў 1622–1639 гг. Нарадзіўся ён у кальвінісцкай сям'і, меў жонку кальвіністку Зоф'ю Рэюўну з Наглавіц ды памёр, відаць, як евангеліст[36]. Захавалася яго ліставанне з 1604–1633 гг. На думку У. Аўгустыняк, менавіта ён у 1628–1633 гг. рэпрэзентаваў інтарэсы біржанскіх Радзівілаў на сойміку ў Оршы[37]. Яшчэ адным прадстаўніком гэтара рода з ліку слуг віленскага ваяводы быў Юры Друцкі-Саколенскі, пакаёвы дваранін караля. Ён атрымаў намінацыю на падчашага аршанскага 3 снежня 1635 г., хаця пачаткова прапаноўваўся на ўрад чашніка[38].

**Стэцкевічы**. Не з'яўляючыся прыхільнікамі пратэстантызму, праваслаўныя Стэцкевічы маглі з'яўляцца магчымымі хаўруснікамі біржанскіх Радзівілаў. Сярод найбольш верагодных супрацоўнікаў Крыштафа Радзівіла быў Ян Вільгельмавіч Стэцкевіч, аршанскі харужы (1628–1636 гг.?)[39]. Паводле меркаванняў Т. Кемпы, Ян Стэцкевіч супрацоўнічаў з біржанскім дваром падчас безкаралеўя 1632 г.: займаўся агітацыяй на аршанскім сойміку і перадаў некалькі дзясяткаў лістоў Радзівіла мясцовай шляхце. Але адназначных доказаў таго, што Я. Стэцкевіч ўваходзіў у кола раздзівілаўскай кліентэлы, польскі гісторык не знайшоў[40].

У Аршанскім павеце біржанскія Радзівілы пазней маглі разлічваць на дастаткова ўплывовых ураднікаў, напрыклад, на намінаванага 13 сту-дзеня 1645 г. на ўрад харужага Мікалая Галоўчынскага, капітана каралеўскай гвардыі[41].

## Віцебскі соймік і біржанскае кола

Цалкам магчыма, што нашы назіранні могуць выглядаць крыху нацягнутымі, але выглядае, што віцебскі соймік у 1630-я гг. не быў так моцна здамінаваны Сапегамі, як сцвярджае У. Аўгустыняк. Няма і прамых доказаў таго, што Віцебск выпадаў з сферы інтарэсаў віленскага ваяводы.

[36] Lidkie M. Od prawosławia do katolicyzmu. S. 158–159.

[37] Augustyniak U. W służbie hetmana... S. 199.

[38] Радаман А., Галубовіч В., Вілімас Д. Земскія ўраднікі Віцебскага ваяводства... С. 60.

[39] Тамсама. С. 57.

[40] Kempa T. Kariery przedstawicieli prawosławnych rodów Ogińskich i Stetkiewiczów w XVII wieku – podobieństwa i różnice awansu społecznego, ekonowicznego i politycznego // Władza i prestiż. Magnateria Rzeczypospoilitej w XVI–XVIII wieku. Białystok, 2003. S. 365.

[41] Sawicki M. Stronnictwo dworskie... S. 44; Радаман А., Галубовіч В., Вілімас Д. Земскія ўраднікі Віцебскага ваяводства... С. 57.

Больш таго, існуюць вельмі важкія доказы адваротнага.

Спынімся толькі на падзеях двух гадоў – 1632 і 1640 гг. Перад элекцыйным соймам 1632 г. віцебскія прыхільнікі Крыштафа Радзівіла прадэманстравалі свае рэальныя магчымасці, дамогшыся відавочнай перавагі над католікамі пры абранні паслоў: яны правялі праз соймік пасламі двух пратэстантаў, двух праваслаўных і двух католікаў[42]. Праз інструкцыю дысідэнты правялі шэраг патрабаванняў аб аднаўленні правоў праваслаўнай царквы і рэалізацыі права на свабоду веравызнання. Другой падзеяй, на якую трэба звярнуць увагу, быў грамнічны соймік ў Віцебскі 1640 г., калі дысідэнты аказаліся здольнымі не толькі патрабаваць, але і дзейнічаць: іх намаганнямі быў праведзены альтэрнатыўны каталіцкаму соймік, абраныя дэпутаты – праваслаўны Сямён Пышніцкі і кальвініст Крыштаф Жаба[43].

Вельмі красамоўнымі сведчаннямі ўплываў Крыштафа Радзівіла таксама з'яўляюцца вынікі выбарчай кампаніі ў Віцебскім павеце перад соймам 1640 г. Віленскі ваявода жадаў (!), каб мясцовы соймік прадстаўлялі кальвіністы, але ў выніку пасламі абралі католікаў, у тым ліку Яна Антонія, сына радзівілаўскага актывіста К. Храпавіцкага, які ў красавіку 1640 г. дакладваў магнату, што паслом згодна абралі «майго сына, слугу Вашай Княскай Міласці…»[44].

## Высновы

Нават простыя падлікі колькасці патэнцыйных прыхільнікаў біржанскіх Радзівілаў дазваляюць сцвярджаць, што, магчыма, не заўсёды, але іх інтарэсы было каму лабіраваць. На сярэдзіну 30-х гг. XVII ст. у земскай адміністрацыі Віцебскага павета каля паловы ўраднікаў былі праваслаўныя альбо кальвіністы (ці паходзілі з кальвінісцкіх сем'яў). Пры наяўнасці такіх актывістаў як Крыштаф Храпавіцкі мабілізаваць павятовую апазіцыю было не вельмі складана – узяць хоць бы падзеі 1640 г. У цэлым жа, канешне, гэта яшчэ трэба падмацаваць дадатковымі дадзенымі, але выснова пра страчанасць, па меншай меры, Віцебскага павета для ўплываў двара К. Радзівіла можа быць аспрэчана.

[42] Kempa T. Wobec kontrreformacji. S. 403.

[43] Deputaci Trybunału Głównego Wielkiego Księstwa Litewskiego (1586–1696): spis. S. 233.

[44] Wasilewski T. Wstęp... S. 27.